РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
13 ВЕРАСНЯ 2025 г. СУБОТА № 177 (30565)

Комплекс будынкаў вінакуранага і спіртавога завода, якія ўпершыню згадваецца ў сярэдзіне VIII стагоддзя, уваходзіў у склад Лошыцкай сядзібы, тэрыторыя якой сёння сфарміравана як Лошыцкі сядзібна-паркавы комплекс. Цяпер гэта любімае месца адпачынку як у жыхароў Ленінскага раёна сталіцы, так і мінчан, гасцей краіны. З работамі па добраўпарадкаванні гісторыка-культурнага комплексу «Лошыцкі», рэалізацыяй плана па навядзенні парадку ў Мінску ў цэлым у пятніцу асабіста азнаёміўся кіраўнік дзяржавы. Будучы ў Лошыцкім парку, Аляксандр Лукашэнка трапіў на першую ў абноўленых залах цырымонію заключэння шлюбу, павіншаваў маладажонаў з гэтай важнай падзеяй у іх жыцці і ўручыў ім ключы ад арэнднай кватэры. Акрамя таго, Прэзідэнт пагутарыў з будаўнікамі, супрацоўнікамі комплексу, грамадскасцю і моладдзю сталіцы, якая да свайго дня нараджэння атрымала такі добры падарунак.

СТАР. 2–4



# «МАЯ ПАЛІТЫКА, А ЗНАЧЫЦЬ, І ВАША, — СТВАРАЦЬ І ЗАХОЎВАЦЬ»

**Прэзідэнт прыняў удзел у адкрыцці ў Мінску гісторыка-культурнага комплексу «Лошыцкі» пасля рэканструкцыі**





Фота БелТА.

ЧАШНІКІ РЫХТУЮЦЦА ДА «ДАЖЫНАК» 13



СПАЖЫВЕЦ

## РОДНАЯ МОВА НА ЦУКЕРКАХ І ХАЛВА З ЦЫБУЛЯЙ

**Распрацоўшчыкі ўпэўнены, што гэта будзе культурны выбух і смакавая бомба**

Кандытарская галіна Беларусі займае асаблівае месца ў эканоміцы і культурным іміджы краіны. Нашы прысмакі вядомы высокай якасцю, традыцыйнымі рэцэптурамі і сучаснымі распрацоўкамі, дзякуючы якім яны паспяхова канкурыруюць на ўнутраным рынку і карыстаюцца попытам за мяжой.

СТАР. 12




Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X
25177>
9 771990 763008

# «МАЯ ПАЛІТЫКА, А ЗНАЧЫЦЬ,

## «АБ'ЯДНОЎВАЦЬ І ПАТРАБАВАЦЬ АД ЛЮДЗЕЙ»

Найперш кіраўніку дзяржавы далажылі аб добраўпарадкаванні Мінска, рэканструкцыі і рэстаўрацыі гісторыка-культурнага комплексу «Лошыцкі».

«Мы ўсё тут аднавілі, што жывое было?» — пацікавіўся Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнту паведамілі, што на тэрыторыі парку яшчэ засталіся два аб'екты, да рэалізацыі якіх ужо прыступілі.

Старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір Кухараў далажыў аб рэалізацыі ў сталіцы плана добраўпарадкавання дваровых тэрыторый, рамонце і афарбоўцы будынкаў, рамонце вулічна-дарожнай сеткі, высадцы дрэў і зялёных насаджэнняў, установцы малых архітэктурных форм і добраўпарадкаванні дзіцячых пляцовак.

«Па добраўпарадкаванні дваровых тэрыторый з 1033 запланаваных ужо зроблена 1048 — гэта значыць, мы выканалі заданне і ідзём далей, — канкрэтызаваў ён. — Тое ж па рамонце і афарбоўцы будынкаў: з 1967 адзінак ужо 1640 выканана (83 %), астатнія ў рабоце. Рамонт вулічна-дарожнай сеткі — важны кірунак: запланавана зрабіць 1,8 мільёна квадратных метраў, з якіх паўтара мільёна ўжо зроблены».

У Мінску актыўна ажыццяўляецца пасадка дрэў. Па словах кіраўніка горада, у вясенні перыяд высаджана каля 80 % кустарнікаў і кветак ад запланаванага, восенню гэта работа будзе завершана. Выкананы план і па замене малых архітэктурных форм. Завяршаюцца работы па ўсталяванні дзіцячых гульнявых пляцовак.

«Акрамя таго, завершана рэканструкцыя Цэнтральнага дзіцячага парка імя М. Горкага», — дадаў Уладзімір Кухараў.

«Там усё зроблена?» — удакладніў кіраўнік дзяржавы.

«Поўнасцю ўсё зроблена», — адзначыў старшыня Мінгарвыканкама і дадаў, што да канца года будуць завершаны работы па добраўпарадкаванні парка імя Уга Чавеса. Уладзімір Кухараў праінфармаваў таксама, што ў Мінску створана 18 новых зон адпачынку.

Асобна старшыня Мінгарвыканкама спыніўся на новым кірунку дзейнасці — рабоце з насельніцтвам па рэалізацыі грамадскіх ініцыятыў. «Калі людзі, у тым ліку за свае грошы, прапануюць добраўпарадкаванне дваровых тэрыторый, — патлумачыў ён. — Сёлета ўжо рэалізавана 14 такіх праектаў».

«Гэта павінна быць задачай для кіраўнікоў тваіх адміністрацый, — даручыў Аляксандр Лукашэнка. — Трэба гэтым займацца. Мабілізоўваць, аб'ядноўваць, угаворваць, прасіць, прапаноўваць і патрабаваць ад людзей. Кожны павінен хоць невялікую капейку ўнесці».



По словах кіраўніка горада, сёлета на мэты добраўпарадкавання насельніцтвам унесена 4,6 мільёна рублёў. Прэзідэнт заўважыў, што для мінчан — гэта невялікія грошы. Па яго словах, гэтым трэба займацца, бо парадак наводзіцца для саміх жа людзей, у тым ліку дзяцей.

Што датычыцца рэстаўрацыі гісторыка-культурнага комплексу «Лошыцкі», Уладзімір Кухараў расказаў, што яшчэ ў найбліжэйшы час з'явіцца на тэрыторыі парку. У прыватнасці, плануецца аднавіць млын.

«І там ты зробіш зноў рэстаран? — пацікавіўся кіраўнік дзяржавы і прапанаваў выкарыстоўваць будучы млын па прызначэнні. — Галоўнае, каб гэты млын быў як раней. Няхай бы ён на электрычнасці быў, а не на вадзе. Гэта было б цікава, а яшчэ пякарню побач».

Пякарня, як праінфармаваў старшыня Мінгарвыканкама, ужо ёсць. Цяпер сталічныя ўлады будуць працаваць над рэалізацыяй прапановы беларускага лідара па аднаўленні млына, выкарыстанні яго па прызначэнні.

Таксама Уладзімір Кухараў расказаў, што плануецца пачаць работы на тэрыторыі Пішчалаўскага замку, які размяшчаецца ў сталіцы. Мэр горада паказаў, як гэты аб'ект будзе выглядаць у перспектыве.

«Трэба так і зрабіць, як тут намалёвана, — паставіў задачу кіраўнік дзяржавы. — Спецыялісты ёсць, якія ўмеюць гэта рабіць. У Мінску ёсць добрыя спецыялісты».

## «НАМ ТРЭБА МІНСК НЕЯК РАССЯЛЯЦЬ»

Каля ўваходу ў будынак шматфункцыянальнага комплексу Прэзідэнта прывітаў гістарычны персанаж «Захавальнік нацыянальных традыцый» і зачытаў даверчую грамату, якая пацвярджае добрыя намеры да пераемнасці і захавання культурнай спадчыны горада Мінска. «Штодня ў гэтым будынку будуць адбывацца значныя падзеі ў жыцці жыхароў сталіцы, захоўвацца і множыцца традыцыі святкавання беларускага вяселля», — сказана ў даверчай грамаце.

Аляксандр Лукашэнка змацаваў грамату сургучнай пячаццю і ўручыў яе дырэктару КСУП «Атэль «Еўропа» Юрыю Гуйдзе, на балансе якога знаходзіцца гісторыка-культурны комплекс «Лошыцкі».

Кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з магчымасцямі шматфункцыянальнага комплексу, у якім прадугледжаны гасцініца на 12 стандартных нумароў, залы для правядзення шлюбных цырымоній, урачыстых сустрэч, іншых мерапрыемстваў.

Акурат у час наведвання Прэзідэнтам комплексу ў зале ўрачыстых мерапрыемстваў ішла цырымонія заключэння шлюбу. Аляксандр Лукашэнка павіншаваў маладажонаў з гэтай важнай падзеяй у жыцці і ўручыў ім ключы ад арэнднай кватэры.

Навaспечаным сужэнцам Дзмітрыю і Паліне Казловым Прэзідэнт пажадаў, каб іх шлюб быў моцным і доўгім, каб маладажоны берaглі адно аднаго, але галоўнае — каб яны былі здаровыя, каб здаровымі былі іх будучыя дзеткі.

«Будуць здаровымі дзеці — у вас настрой будзе, і працаваць будзе цікава, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Калі дзеці хварэюць — бяда. Таму здароўя вашым дзецям. Ну, і самі каб здаровымі былі».

Бацькам маладажонаў кіраўнік дзяржавы пажадаў усяго найлепшага, шчасця і поспехаў. «Вы не хвалюйцеся, вам працы яны падкінуць, — маючы на ўвазе будучых унукаў, сказаў Прэзідэнт. — І каб пабольш працы! Траіх! Нам трэба, каб у сям'і было трое дзетак».

Маладыя паабяцалі, што наказ кіраўніка дзяржавы пастараюцца выканаць.

Арэндная кватэра, ключы ад якой маладажоны атрымалі з рук беларускага лідара, знаходзіцца ў Смалявічах. «Кватэра з намёкам, — удакладніў Аляксандр Лукашэнка. — Каб там (у Смалявічах. — **«Зв.»**) жылі. Працаваць можаце прыязджаць (у Мінск. — **«Зв.»**). У гэтым задума. Нам трэба Мінск неяк рассяляць».

Карыстаючыся магчымасцю, маладая сям'я Казловых папрасіла Прэзідэнта аб сумесным фотаздымку. Аляксандр Лукашэнка, як заўсёды, не адмовіў.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*





# І ВАША, — СТВАРАЦЬ І ЗАХОЎВАЦЬ»

## «ТУТ ЗРОБЛЕНА ЎСЁ, КАБ ЛЮДЗІ ПРЫХОДЗІЛІ СЮДЫ І АДПАЧЫВАЛІ»

Падчас наведвання гісторыка-культурнага комплексу Аляксандр Лукашэнка пагутарыў з удзельнікамі мерапрыемства. Сярод іх — будаўнікі, супрацоўнікі комплексу, прадстаўнікі грамадскасці і моладзі сталіцы.

### «БУДЗЕМ З ХЛЕБАМ. БУДЗЕМ З БУЛЬБАЙ»

Кіраўнік дзяржавы выказаў падзяку будаўнікам за зробленае. Ён заўважыў, што ў дадзены момант наведванне такіх аб'ектаў у прэзідэнцкім графіку з'яўляецца рэдкасцю. «Бо хлеб трэба было ўбраць», — патлумачыў ён. — Хлеб убралі».

Аляксандр Лукашэнка нагадаў: раней заяўлялася, што агульны каравай 2025 года павінен важыць не менш за 11 мільёнаў тон. На цяперашні момант убралі 9 мільёнаў тон каласавых разам з рапсам. Па словах кіраўніка дзяржавы, калі да іх дадаць яшчэ і кукурузы 2 мільёны тон, як плануецца ўбраць, то і атрымаецца 11 мільёнаў тон.

«Гэта вельмі шмат, — падкрэсліў беларускі лідар. — Рэдка якая краіна збірае на душу насельніцтва столькі хлябоў. Гэта значыць, будзем з хлебам.

Што датычыцца бульбы, я ўжо шмат разоў казаў, усё спрабую аналізаваць, што ў Беларусі адбылося. Фактараў шмат. Мы ведаем іх, больш не дапусцім. Але галоўнае, што ў нас сусед такі багаты, што ён гатовы плаціць для сялян любыя грошы. Як толькі ў іх бульба знікла, яны, як пыласосам, забралі ў нас усю гэту бульбу, таму мы вымушаны былі высяваць больш. І сёлета добры ўраджай — будзем з бульбай».

Прэзідэнт праінфармаваў, што на днях у сталіцы і іншых гарадах пачнуць работу кірмашы з сельгаспрадукцыяй, на якіх можна будзе купіць і бульбы, і іншай агародніны, і садавіны. «Акрамя костачкавых і яблыкаў, — удакладніў ён. —Сёлета Гасподзь нас крыху па галаве стукнуў, гэтага дабра ў нас будзе менш».

### «МЛЫН ТРЭБА ЗБЕРАГЧЫ»

Кажучы аб культурна-гістарычным комплексе «Лошыцкі», які адкрылі пасля рэканструкцыі, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Мая палітыка, а значыць, і ваша, — ствараць і захоўваць. Вось мы захоўваем сваю культурную спадчыну, аднаўляем, будуем. Мы гэта будзем рабіць і далей. Я вельмі хачу, каб гэта месца стала прыцягненнем для нашых людзей. Каб тут і вяселлі былі, і іншыя ўрачыстасці. Тут будуць і рэстараны (дастатковая колькасць месцаў), і гасцініцы. Тут зроблена ўсё для таго, каб людзі прыходзілі сюды і адпачывалі».

Прэзідэнт праінфармаваў аб далейшых планах сталічных улад па добраўпарадкаванні комплексу. «Мэр Мінска гаворыць, што стары млын яны тут адновяць і зробяць там чарговы рэстаран, — канкрэтызаваў Аляксандр Лукашэнка. — Таксама нядрэнна, але я ўсё ж такі прыхільнік таго, каб там, дзе быў млын, быў старажытны млын, каб вы прыйшлі і паглядзелі, што ж гэта за млыны былі раней».

Кіраўнік дзяржавы расказаў, што ў сваім дзяцінстве бачыў на рацэ такі млын. Ім актыўна карысталіся. Ён прапанаваў і ў аднаўленым у Лошыцкім парку млыне малоць зерне, сабранае ў Беларусі, затым з яго выпякаць хлеб і прапаноўваць людзям. Беларускі лідар упэўнены, што і з Расіі прыязджалі б сюды для таго, каб купіць гэты хлеб.

І такая практыка ўжо ёсць. На радзіме Прэзідэнта адноўлена невялічкая хлебапякарня. Вядома, з выкарыстаннем сучаснага абсталявання. «З Оршы і з Магілёва, нават са Смаленска прыязджалі і куплялі гэты хлеб, — распавёў Аляксандр Лукашэнка. — Вымушаны былі пашырацца. Пры тым гатовы купляць па любой цане, але нам гэта не трэба. Цэны мы павінны трымаць у парадку, наколькі гэта сёння магчыма».

### «НЕ СПЯШАЦЦА ЗАБУДОЎВАЦЬ МІНСК»

Звяртаючыся да гісторыі культурна-гістарычнага комплексу «Лошыцкі», кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў 1990-я гады гэта месца было павінна знікнуць з карты сталіцы, яго хацелі зраўнаваць з зямлёй. Каб гэтага не было, дзяржава пайшла іншым шляхам — аднавіла гістарычную сядзібу, якая цяпер радуе і будзе радаваць мінчан і не толькі.

Па словах Прэзідэнта, ёсць яшчэ некалькі праектаў у Мінску, якія будуць ажыццёўлены. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы заўважыў, што гэта важна не столькі для людзей ва ўзросце, а для моладзі. «Гэта будуецца для маладых людзей, каб яны асвойвалі і засвойвалі нашу культуру, нашу гісторыю і гэтак далей, — патлумачыў ён. — Мы ў Мінску не толькі ў гэты Год добраўпарадкавання, але ў наступныя гады поўная рашучасці навесці парадак. Далей ужо будзеце самі падтрымліваць гэты парадак. Зробім усё для таго, каб у вас тут было кудысьці прыйсці і адпачыць».

Аляксандр Лукашэнка перажывае, праязджаючы па Мінску, за тое, што, магчыма, робіць сталіцу вельмі «вясковай». У той час як маладыя людзі, магчыма, хочуць пабольш будынкаў са шкла, бетону. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы заўважыў, што наўрад ці людзям зручна жыць у гэтых шкляных небасхробах.

«А дзеткі з'явяцца (а гэта вельмі хутка адбываецца), тады вы зразумееце, што гэта такое, калі можна з дзіцяткам кудысьці выйсці, спакойна выйсці», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. І тут, па яго словах, узнікае іншае пытанне — бяспека людзей. І з гэтай задачай дзяржава паспяхова спраўляецца.

**«Нам не трэба спяшацца забудоўваць Мінск, шпігаваць там, дзе нашы бізнесмены вельмі хочуць, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — З жыллём мы ўжо дакладна вызначыліся. Думаю, Мінск ужо прызвычаіўся. Гэта было маё жорсткае патрабаванне, і я не адступлю ад яго».**

Будаўніцтвам жылля ў сталіцы займаюцца дзяржаўныя кампаніі, якія могуць гарантавана выканаць работы, не дапусцяць якіх-небудзь махінацый і завышэння кошту, як гэта адбывалася раней з некаторымі прыватнікамі. Як заўважыў кіраўнік дзяржавы, створаны магчымасці для будаўніцтва ў сталіцы і ў прыватных інвестараў. Але пры ўмове, калі яны гатовы браць на сябе сацыяльную нагрузку. У якасці прыкладу Аляксандр Лукашэнка прывёў інвестараў з Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў, якія будуюць у Мінску мікраён «Паўночны Бераг». У якасці сацыяльнай нагрузкі яны ўзвялі Мінскі міжнародны выставачны цэнтр.

«Вось той, хто прывязе ў Беларусь нешта, — калі ласка», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Усё астатняе, па яго словах, — за дзяржаўнымі будаўнічымі арганізацыямі. Такая палітыка, звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы, будзе працягвацца і далей.

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы дадаў, што ў прыярытэце — будаўніцтва жылля ў гарадах-спадарожніках Мінска. «Рудзенск, Дзяржынск, Смалявічы, Лагойск — вось чатыры-пяць пунктаў вакол Мінска, там будзем узводзіць жыллё», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён удакладніў, што ў найбліжэйшай будучыні гарады-спадарожнікі звяжуць са сталіцай хуткімі транспартнымі зносінамі.

**«Жывіце ў сябе дома, мы будзем рабіць усё для таго, каб вам было зручна», — адзначыў беларускі лідар.**

### «НАШЫ БУДАЎНІКІ СЁННЯ ЎМЕЮЦЬ РАБІЦЬ УСЁ»

Аляксандр Лукашэнка звярнуўся да будаўнікоў, якія прымалі ўдзел у рэканструкцыі комплексу, падзякаваў ім за работу і ў іх асобе пахваліў у цэлым усіх прадстаўнікоў будаўнічай сферы.

«Нашы будаўнікі сёння ўмеюць рабіць усё», — падкрэсліў Прэзідэнт і адзначыў, што айчынныя будаўнікі запатрабаваны і за мяжой, у тым ліку ў Расіі. Яны зарэкамендавалі сябе як прафесіяналы з высокай кваліфікацыяй.

«Вельмі добра, што захавалі будаўнікі сваю савецкую школу», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. Ён нагадаў, што ў савецкія часы менавіта ў Беларусі функцыянавалі цэнтры, дзе навучаліся будаўнікі з усяго гіганцкага Савецкага Саюза.

«Мы ў многім гэта аднавілі і прымножылі. Гэта вялікая заслуга», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Па словах Прэзідэнта, запатрабаванасць беларускіх спецыялістаў прымушае кіраўнікоў будаўнічых арганізацый павышаць зарплату работнікам, каб пазбегнуць адтоку кадраў.

**«Толькі трэба разумець, што, калі хочаш шмат зарабіць, — трэба шмат працаваць, — адзначыў беларускі лідар. — Іншага не дадзена. Ні адзін Прэзідэнт, ні адзін мэр вам іншага рэцэпта не выпіша».**

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*







# МАЛАДОСЦЬ, ПРЫГАЖОСЦЬ, ІНТЭЛЕКТ І ТАЛЕНТ

## Усё гэта аб'яднаў XIV Нацыянальны конкурс «Міс Беларусь — 2025»

Грандыёзны фінал конкурсу прайшоў у сталічным Палацы спорту. Гэты вечар стаў прыгожай кропкай напружанага працоўнага тыдня Прэзідэнта Беларусі Аляксандра ЛУКАШЭНКІ. Кіраўнік дзяржавы таксама наведаў шоу ў Палацы спорту.




Усяго ў конкурсе паўдзельнічала больш за 500 дзяўчын. Але ў фінал прайшлі толькі 24 прыгажуні. Дарэчы, не ўсе з іх мадэлі. За карону «Міс Беларусь» таксама спрачаліся студэнткі — будучыя ўрачы, інжынеры, аграрыі, настаўніцы — прыгожыя і таленавітыя беларускі.

Ідэя фінальнага шоу пад назвай «Сусвет прыгажосці» звязана з прыгажосцю як натхняльнай сілай для здзяйсненняў, подзвігаў і творчых перамог.

Авацыі гледачоў удзельніцы фіналу сарвалі за нумар у нацыянальных строях, дзе дэманстраваліся сімвалы беларускага арнаменту. Шчырае замілаванне, весялосць і радасць падарылі гледачам відэаролікі аб добрых справах, якія паспелі зрабіць дзяўчаты за час падрыхтоўкі да фіналу.

Адно з дэфіле прайшло ў арыгінальных вобразах — касцюмах з тэматычнымі цытатамі Прэзідэнта Беларусі. Сярод іх былі выказванні кіраўніка дзяржавы аб тым, што прыгажэй за беларускіх жанчын няма ў свеце, што яны — наша самая эфектыўная дыпламатычная зброя, што шчасце жанчын — гэта самая вялікая каштоўнасць, а іх пакліканне — упрыгожваць свет.

**А па выніках усіх іспытаў пераможцай конкурсу і ўладальніцай галоўнага тытула стала 18-гадовая Алена КУЧАРУК з Полацка.**

Па традыцыі ўсе ўдзельніцы фіналу атрымалі ў падарунак ад кіраўніка дзяржавы фантастычнай прыгажосці вячэрнія сукенкі, у якіх яны з'явіліся на подыуме ў завяршальным дэфіле.

**Фота БелТА.**

# «МАЯ ПАЛІТЫКА, А ЗНАЧЫЦЬ, І ВАША, — СТВАРАЦЬ І ЗАХОЎВАЦЬ»

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што будаўнікі годна вялі сябе ў 2020 годзе. «Вы малайцы, мы з вамі ў 2020 годзе перажылі мяцеж: разумелі, што магло б быць, — канстатаваў ён. — Цяпер вы разумееце, гледзячы на Украіну. А мне даводзіцца кожны дзень працаваць з гэтым. Ведаеце, амерыканская дэлегацыя ў нас рэгулярна тут бывае. Мы з імі вядзём пэўныя перагаворы. Мы зробім так, як гэта патрэбна для нас. І не кажыце, што «мы вось маленькая такая рэспубліка, мы нічога не можам». Не залежыць ад памеру: маленькая, вялікая і гэтак далей. Цяпер гэта залежыць ад таго, наколькі мы адзіныя і наколькі мы хочам жыць на сваёй зямлі, каб намі не кіравалі».

Кіраўнік дзяржавы прапанаваў кожнаму рабіць на сваім месцы ўсё для таго, каб у Беларусі жыць, працаваць, будаваць, мадэрнізаваць, але не ваяваць. Тым, хто ў комплексе будзе працаваць, ён даў настаўленне — берагчы гэты аб'ект, падтрымліваць на ім парадак у тым ліку ўласным прыкладам, працуючы на зямлі.

Прэзідэнт заклікаў усіх мінчан падключацца да добраўпарадкавання сталіцы. «Суботнікі, суботнікі — прыводзьце ў парадак, — канкрэтызаваў ён. — Трэба калупацца на зямлі. Каб не ў рэстаране толькі сядзелі, а на зямлі. І пажадана — басанож. Будзеце хадзіць басанож — хварэць не будзеце. Мая вам парада».

## «ВАКОЛ УСЁ ПАВІННА БЫЦЬ ГОДНА І ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ»

Кажучы аб тым, чаго не хапае сталіцы, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў нас ёсць усё. «Проста трэба развівацца, — акцэнтаваў увагу ён. — Вось цяпер мы выявілі: не хапае гасцініц і рэстаранаў. Ну, што, праблема вялікая? Галоўнае, каб людзі хадзілі туды».

Па словах Прэзідэнта, Беларусь з'яўляецца папулярным месцам адпачынку для расіян, якія прыязджаюць да нас па цішыню. «Яны хочуць прыехаць, тут спакойна адпачыць, — канкрэтызаваў ён. — Але, самае галоўнае, паехала і сярэдзіна грамадства. Звычайныя людзі — такія, як мы. Яны прыязджаюць сюды, адзначаюць, што гэта зусім іншая краіна. Ужо з нас бяруць прыклад, як трэба жыць і развівацца».

Аляксандр Лукашэнка параіў беларусам нармальна ўспрымаць іншаземцаў. «Мы ўвялі бязвіз для ўсіх, — нагадаў ён. — Для нас там закрываюць усё, а мы ім: «Прыязджайце, глядзіце!» Ну, нагрузка невялікая міліцыі, спецслужбам, але гэта іх праца, грошы ж яны за гэта атрымліваюць. Але сюды ж прыязджаюць не бедныя людзі. Яны прывозяць сюды грошы».

Беларускі лідар падкрэсліў, што Мінску ўсяго хапае. «Але нам трэба гэты лоск зрабіць, — удакладніў ён. — Калі гэта Лошыцкі парк, сядзіба — вось так трэба зрабіць. Калі гэта Чыжоўка (мы там пабудавалі спартыўна-культурны комплекс), вакол усё павінна быць годна і для людзей».

Прэзідэнт даў добрую ацэнку сталічным уладам, што ў той жа Чыжоўцы пракладлі лыжаролерную трасу. Рэгулярныя заняткі спортам, па словах беларускага лідара, дазваляюць захаваць здароўе. У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы прывёў у прыклад жыхароў Кітая, дзе фізкультурай і спортам масава займаецца не толькі моладзь, але і пенсіянеры.

«Займайцеся спортам, — рэкамендаваў заўсёды Аляксандр Лукашэнка, паўтарыў і цяпер. — Дзве гадзіны ў дзень. І вадзіце за сабой сваіх дзяцей. Гэта дзеля таго, каб вы менш валяліся ў бальніцах, каб вы былі здаровыя. Здароўя вам! Як я гавару, усё астатняе мы купім».

## ВОСЕНЬСКІЯ КІРМАШЫ ЎЖО ХУТКА

У завяршэнні размовы кіраўніка дзяржавы з удзельнікамі мерапрыемства юная мінчанка Яўгенія падарыла Аляксандру Лукашэнку карціну, якую напісала, натхніўшыся атмасферай Лошыцкага парка. Прэзідэнт падарунак з задавальненнем прыняў, паабяцаўшы размясціць карціну ў Палацы Незалежнасці.

Кіраўнік дзяржавы перадаў юнай мастачцы прысмакі, але гэтым вырашыў не абмяжоўвацца: у найбліжэйшы час дзяўчына атрымае вялікі мех прэзідэнцкай бульбы. Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся ў мастачкі, ці любіць яна бульбу. Высветлілася, што любіць. «Я страшна люблю, — падзяліўся ён. — Учора зграшыў, з'еў».

Кажучы аб новым сорце бульбы, Прэзідэнт даручыў падзяліцца ім з насельніцтвам, каб на ўчастках апрацоўвалі. «Вось у каго ёсць дача або ўчастак, магу перадаць, бо насенную бульбу проста так раздаваць нельга», — удакладніў ён. Усіх астатніх кіраўнік дзяржавы заклікаў прыходзіць на восеньскія кірмашы і купляць бульбу па прымальным кошце.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**



АКЦЭНТЫ

# АГРАРНЫ ВЕКТАР

## На кантролі ва ўрадзе — развіццё сялянскіх фермерскіх гаспадарак

**Прэм'ер-міністр Аляксандр Турчын наведаў сялянскую фермерскую гаспадарку «СПАРТАН-Агра» ў Маладзечанскім раёне, якая займаецца вырошчваннем яблыкаў і іншай сельскагаспадарчай прадукцыі, паведамілі ў прэс-службе ўрада.**

Сёлета ўмовы надвор'я адбіліся на ўраджайнасці саду — замест чаканых 3 000 тон гаспадарка прагназуе атрымаць не больш за 300 тон яблыкаў. Абмеркаваны пытанні аб магчымай дзяржаўнай падтрымцы, а таксама аб пашырэнні лінейкі прадукцыі, якая вырабляецца, будаўніцтве агароднінасховішча і пастаўцы прадукцыі ў гандлёвыя сеткі.

Прэм'ер-міністр таксама пагутарыў з мясцовым фермерам Ігарам Пакушам, які расказаў пра свае планы па развіцці вытворчасці. Аграрый падзяліўся планамі аб перспектывах вырошчвання агародніннных культур, вінаграду і бульбы, а таксама аб амбіцыйных праектах па перапрацоўцы, у прыватнасці па вытворчасці бульбы фры.

Кіраўнік урада падтрымаў ідэю аб развіцці такіх гаспадарак, адзначыўшы, што гэта дасць магчымасць павысіць іх рэнтабельнасць.

Аляксандр Турчын даручыў прапрацаваць пытанні магчымага садзейнічання з боку дзяржавы і запэўніў, што ўрад гатовы аказаць падтрымку ў вырашэнні агучаных пытанняў.



# ЯКІМ БУДЗЕ ЗАЎТРА НАШАЙ КРАІНЫ

## У Авальнай зале прайшоў урачысты сход, прысвечаны Дню народнага адзінства

**У пятніцу дэпутацкі корпус на чале са Старшынёй Палаты прадстаўнікоў Ігарам СЕРГЯЕНКАМ напярэдадні дзяржаўнага свята правёў сустрэчу з людзьмі, якія ўносяць важкі ўклад у захаванне народнага адзінства.**

Сярод запрошаных гасцей — прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці ўсіх абласцей і Мінска, якія ўзначальваюць ваенна-патрыятычныя клубы, праводзяць пошукавыя мерапрыемствы, адкрываюць і захоўваюць помнікі, мемарыяльныя знакі, устанаўліваюць імёны загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны і тым самым уносяць вялікі ўклад у патрыятычнае выхаванне насельніцтва і захаванне гістарычнай памяці. На ўрачыстым мерапрыемстве таксама прысутнічалі самыя таленавітыя выпускнікі 2025 года — абітурыенты, якія набралі найбольшую колькасць балаў падчас уступных экзаменаў, а таксама члены Маладзёжнага савета пры Палаце прадстаўнікоў.

Перад пачаткам мерапрыемства яго ўдзельнікі азнаёміліся з выстаўкай «Беларусь адзіная. Да гісторыі свята», прысвечанай Дню народнага адзінства. Экспазіцыя прысвечана гістарычнаму лёсу беларускага народа, яго шляху да нацыянальна-дзяржаўнага самавызначэння і аб'яднанню Заходняй Беларусі і БССР у 1939 годзе. Кніжна-дакументальныя і ілюстрацыйныя экспанаты выстаўкі раскрываюць сэнс і значэнне свята, якое сімвалізуе адзінства народа Беларусі ў імкненні да міру і незалежнасці.

«Наша сустрэча праходзіць напярэдадні Дня народнага адзінства, — звярнуўся да ўдзельнікаў урачыстага сходу Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар Сергяенка. — Гэтымі днямі мы аддаём даніну памяці гістарычнаму мінуламу і адначасова накіроўваем свой погляд у будучыню. Шануем нашых гераічных продкаў, дзякуючы якім жывём сёння на сваёй зямлі, у сваёй дзяржаве і захоўваем суверэнныя правы самастойна распараджацца сваім лёсам. Мы ўвесь час задаёмся пытаннем: «Якім будзе заўтра нашай краіны?» Адказ просты — яно будзе такім, якім зробім яго мы з вамі — пакаленне беларусаў, якое цяпер жыве. І ніяк інакш».

Спікер нагадаў, што 86 гадоў таму ў сценах Авальнай залы была напісана слаўная старонка ў летапісе беларускай дзяржаўнасці, здзейснены акт найвялікшай гістарычнай справядлівасці: «Менавіта тут 14 лістапада 1939 года на пазачарговай сесіі Вярхоўнага Савета БССР першага склікання быў прыняты Закон «Аб прыняцці Заходняй Беларусі ў склад Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі». Аднаўленне народнага адзінства стала найважнейшай вяхой на шляху далейшага нацыянальна-дзяржаўнага развіцця.



Фота БелТА.

**Ігар СЕРГЯЕНКА ўзнагароджвае старшыню Беларускага саюза блакаднікаў Ленінграда Марыю ЯГАДНІЦЫНУ.**

А да гэтага былі гады самаадданага супраціву паліцэйскаму тэрору, палітыцы паланізацыі беларускага народа, якая праводзіцца ўладамі буржуазнай Польшчы. І мы бачым, што сёння адбываецца на нашых граніцах, як паводзіць сябе сучасная Польшча ў адносінах да нашай краіны. Не пабаюся гэтага сказаць, але самым прыязным перыядам у нашых адносінах з боку нашых суседзяў быў савецкі перыяд, калі існавала Польская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка».

Ігар Сергяенка працітаваў словы кіраўніка дзяржавы: «Мы павінны памятаць, а нашы дзеці павінны ведаць, калі і як перакройваліся беларускія граніцы, каб дагадзіць чужым нацыянальным інтарэсам і як гэта — жыць на роднай зямлі, але ў чужой дзяржаве». Паводле слоў спікера, барацьба за нацыянальную годнасць знаходзіла гарачы водгук у сэрцах беларусаў. І калі пасля вызвалення ў Заходняй Беларусі пачаўся працэс фарміравання органаў мясцовага самакіравання, паўсюдна назіралася высокая грамадская актыўнасць. «Калі б не было гэтых падзей, волі, праяўленай кожным з іх удзельнікаў, Беларусь і дагэтуль заставалася б разарванай, нашы сем'і — падзеленымі, а беларусы — забылі родную мову, веру і традыцыі. Тыя, хто прыняў лёсавызначальнае рашэнне ў 1939 годзе, а затым грудзьмі абаранілі свой выбар у гады Вялікай Айчыннай вайны і адрадзілі краіну з руін, былі самыя звычайныя людзі, такія ж, як і мы з вамі — сяляне, рабочыя, студэнты, жанчыны і мужчыны, пажылыя і маладыя. І гэта важны для ўсіх урок, — адзначыў Ігар Сергяенка. — Ніхто не мае права аддзяляць сябе ад гістарычнага працэсу. Сумеснымі намаганнямі, кожны на сваім месцы, памятаючы пра абавязак перад Радзімай, мы пішам сучасную старонку гісторыі суверэннай Беларусі і закладваем тым самым асновы будучыні».

І гэта зусім не перабольшанне. «Менавіта дзякуючы адзінству мы ў неверагодна складаных знешнепалітычных умовах працягваем жыць пад мірным небам і паспяхова развівацца, застаючыся моцнымі эканамічна, палітычна і духоўна», — канстатаваў спікер.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**


**ООО «Реалконсалтинг»**
**извещает о проведении открытого аукциона № 26/25 по продаже торгового помещения в Бобруйске**

Предмет аукциона:
Лот № 1 – **Изолированное помещение с инвентарным номером 710/D-3949, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Октябрьская, 136-103, площадь – 883,3 кв. м, наименование – Помещение магазина, назначение – Торговое помещение.**
Обременение: ипотека.
Начальная цена – 1 710 000 белорусских рублей

Аукцион проводится **17.10.2025 с 10.00 до 16.00** в форме электронного аукциона на электронной торговой площадке «РЕАЛТОРГИ» по адресу: https://realtorgi.by/ (далее – ЭТП).
**Заявки на участие в аукционе принимаются по 15.10.2025 включительно до 17.00**

**Для участия в аукционе необходимо:**
1. внести задаток в размере 1000 рублей на расчетный счет продавца BY59PJCB30125124941000000933 в ОАО «Приорбанк», БИК PJCBBY2X, получатель платежа – ООО «Ритейл Репаблик», назначение платежа – «Задаток для участия в аукционе № 26/25»;
2. пройти регистрацию на ЭТП и подать заявку на участие в аукционе с приложением документов, предусмотренных Регламентом ЭТП

Аукцион проводится в соответствии с Регламентом ЭТП (размещен по адресу: https://realtorgi.by/reglament-etp). Подавая заявку на участие в аукционе, участник аукциона принимает условия размещенного на странице лота (вкладка «Договор и документы») соглашения о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения электронного аукциона.
Победителем аукциона объявляется участник, предложивший наибольшую цену. Шаг аукциона: 5 процентов от начальной цены. В случае если заявка на участие по лоту подана только одним участником (далее – единственный участник), лот продается этому участнику с его согласия по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.
Победитель аукциона (единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона) возмещает организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня его проведения.
Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона – в течение 20 дней со дня проведения аукциона. Срок оплаты предмета аукциона по договору купли-продажи – в течение 30 дней со дня проведения аукциона, если стороны договора не договорятся об ином сроке.
Победителю аукциона (единственному участнику, согласившемуся приобрести предмет аукциона по цене, увеличенной на 5 процентов) внесенный задаток учитывается в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи предмета аукциона, другим участникам – возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Собственник имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до даты проведения аукциона

**Организатор аукциона и оператор ЭТП: ООО «Реалконсалтинг», УНП 191302068, г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8. тел.: +375 (17) 256 61 35, +375 (25) 549 86 22; auction@expertiza.by, https://www.expertiza.by. Продавец – ООО «Ритейл Репаблик», г. Барановичи, ул. Советская, д. 55, УНП 291372360**



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона / оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «АстиконСнаб», г. Минск, ул. Лынькова, дом 17, корп. 3Н, комн. 1Д |
| **Предмет электронных торгов: оборудование (б/у), расположенное по адресу: г. Минск, ул. Монтажников, д. 53** | **Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.** |
| **Лот № 1:** Станок для производства полотенец МН-230/2, 2019 г. в., инв. номер 70 | **34 600,00** |
| **Лот № 2:** Линия по производству туалетной бумаги, инв. номер 59 | **34 600,00** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату внесения платежа на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **8 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 28.08.2025 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 02.10.2025 г. с 11.00 до 13.00**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **01.10.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33, +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

**БЕЛАРУСБАНК**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

## ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА НЕДВИЖИМОСТИ

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Гродненское областное управление № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк».

| | |
|---|---|
| **Наименование объекта продажи** | **Изолированное помещение с инвентарным номером 452/D-2611 общей площадью 141,5 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, Зельвенский район, г.п. Зельва, ул. Победы, 1-2** |
| **Начальная цена продажи** | 64320,00 (шестьдесят четыре тысячи триста двадцать белорусских рублей 00 копеек), в том числе НДС по ставке 20 % – 10720,00 (десять тысяч семьсот двадцать белорусских рублей 00 копеек) |
| **Сумма задатка** | 6400,00 (шесть тысяч четыреста белорусских рублей 00 копеек) |
| **Открытый аукцион состоится** | **16.10.2025 в 10.00 часов** по адресу: г. Гродно, ул. Новооктябрьская, 5, актовый зал (помещение на третьем этаже) |
| **Заявления и документы на участие принимаются** | **В рабочие дни с 09.00 до 17.00, в пятницу – до 15.45, до 16.00 часов по 14.10.2025 включительно по адресу: г. Гродно, ул. Новооктябрьская, 5, кабинет 307** |
| **Дополнительные условия** | - подлежат возмещению расходы ОАО «АСБ Беларусбанк» по проведению рыночной оценки в размере 472,68 белорусских рублей (четыреста семьдесят два белорусских рублей 68 копеек);<br>Объект недвижимости имеет следующее обременение:<br>- изолированное помещение с инвентарным номером 452/D-2611 в полном объеме передано в аренду |
| **Продавец** | ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается и регистрируется в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» |
| **Контактные данные** | По вопросам, связанным с организацией осмотра объектов продажи и проведения аукциона, обращаться по телефонам: +375 (152) 737326, +375 (1564) 72610, +375 (44) 5455954 (А1), +375 (29) 3129906 (А1) |

*Для участия в открытом аукционе предоставляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка до 14.10.2025 на счет № BY69AKBB66708597000020000000, открытый в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 100325912, назначение платежа – задаток для участия в аукционе.*

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Открытый аукцион проводится путем пошагового увеличения цены. Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной цены. Аукцион проводится при наличии не менее двух допущенных к участию в нём участников. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона. Победителю аукциона задаток не возвращается, а учитывается при окончательных расчётах по приобретению предмета аукциона.

Если заявка на участие в аукционе подана только одним участником, аукцион признается несостоявшимся. В данном случае предмет аукциона продается участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель аукциона возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан не позднее 30 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты его проведения.

УНП 100325912


АКЦЫЯ

# АДЗІНСТВА ЯК ГАЛОЎНАЯ ЎЛАСЦІВАСЦЬ НАЦЫІ

## Якой беларусы бачаць будучыню роднай краіны

Рэспубліканская акцыя «Беларусь адзіная» сабрала ў Кобрыне каля 650 удзельнікаў з розных гарадоў і раёнаў Брэсцкай вобласці. Цэнтральная тэма форуму — стратэгія будучыні краіны.



Фота БелТА.

Як адзначыў **аналітык БІСД Аляксей АЎДОНІН**, азначаная тэма — гэта ўнутраны запыт нашага грамадства. Беларусы хочуць бачыць вобразы будучыні, куды будзе рухацца краіна ў гэтых няпростых умовах.

Паводле яго слоў, такія дыялогі патрэбны, каб разам пагаварыць аб дасягненнях краіны і перспектывах. «У нас ёсць вельмі моцны эканамічны базіс, вытворчы, навукова-тэхналагічны. Мы значна мацнейшыя, чым краіны Еўропы ў бягучых умовах. У нас больш перспектыў, нават калі яны поўнасцю закрыюць усе свае граніцы. Таму што ў нас ёсць рэсурсы, свае рынкі. Мы, у прынцыпе, можам развівацца самастойна. У нас ёсць вялікі азіяцка-ціхаакіянскі рынак. Той жа саміт ШАС, які праходзіў у Пекіне і аб'яднаў многія краіны, паказаў, што ў большай ступені ў ізаляцыі знаходзяцца самі ініцыятары санкцый і націску», — заўважыў аналітык.

Выказаўся эксперт і наконт закрыцця Польшчай граніцы: «Дзеянні з боку Польшчы, вядома ж, маюць вельмі недружалюбны характар, арыентаваны на тое, каб эскаліраваць сітуацыю ва Усходняй Еўропе. Зразумела, што Варшава гэта робіць не самастойна, па ўказанні Бруселя, у першую чаргу камандавання і кіраўніцтва НАТА. Гэта прывядзе да наступстваў палітычнага, эканамічнага, фінансавага характару».

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Таццяна ІГНАЦЮК** падкрэсліла, што адзінства беларускай нацыі — не абстрактнае паняцце. «Гэта рухаючая сіла, якая складаецца з мудрасці старэйшых пакаленняў і падмацоўваецца жывой энергіяй нашай моладзі. Яна адзіная ў сваіх памкненнях і ўпэўнена скіравана на стваральную будучыню нашай Беларусі. Толькі шчыра палюбіўшы сваю краіну, даведаўшыся яе традыцыі, жывучы імі і разуменнем таго, што адбываецца вакол, мы можам стварыць яркую, квітнеючую будучыню нашай краіны», — перакананы Таццяна Ігнацюк.

Па словах **дэпутата Палаты прадстаўнікоў Паўла ПАПКО**, у сітуацыі, калі ў свеце пануе нестабільнасць, беларусы яшчэ больш згуртаваліся. «Мільёны людзей аб'ядналіся вакол дасягненняў сваіх продкаў. Гэта самае галоўнае. Мы не даём абясцэньваць працу і тыя вынікі, якія былі дасягнуты папярэднімі пакаленнямі», — падкрэсліў парламентарый.

Удзельнікі форуму «Беларусь адзіная» таксама пазнаёміліся з выстаўкай «ТэхнаКод Брэстчыны», дзе студэнты ўніверсітэтаў Брэсцкай вобласці, навучэнцы васьмі ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, чатырох устаноў дадатковай адукацыі і трох каледжаў прадставілі больш за 40 праектаў.

**Па матэрыялах БелТА.**

ЭКСКУРСІЯ

# МАТЫВАЦЫЯ СЛУЖЫЦЬ СУМЛЕННА І АДКАЗНА

## Супрацоўнікі Следчага камітэта наведалі Палац Незалежнасці

Да Дня супрацоўніка органаў папярэдняга следства ім была дадзена магчымасць прайсціся па залах галоўнага сімвала беларускай дзяржаўнасці, аднаго з самых вядомых будынкаў не толькі Мінска, але і ўсёй краіны.

Традыцыйна экскурсія пачалася з Залы ўрачыстых цырымоній, дзе яшчэ перад яе пачаткам гасцям Палаца быў дадзены час палюбавацца дзясяткамі карцін беларускіх мастакоў.

Усе інтэр'еры Палаца вытрыманы ў класічным стылі, але кожнае памяшканне ўсё роўна па-свойму ўнікальнае. Асаблівы гонар — 23 вялізарныя люстры і больш за 150 бра. Усе яны, як і астатняе напаўненне залаў, зроблена беларускімі майстрамі і прадпрыемствамі. Напрыклад, светлавое абсталяванне — вытворчасці лідскага ЗАТ «Каскад». Беларускі каларыт залам надае нацыянальны арнамент па матывах слуцкіх паясоў — сімвала беларускай культуры і гістарычнай спадчыны.

Зялёная зала Палаца Незалежнасці, у сваю чаргу, вядомая далёка за межамі краіны: 11—12 лютага 2015 года тут праходзіла большая частка перагавораў з удзелам лідараў Расіі, Украіны, Францыі і Германіі. За сталом Вялікай залы перагавораў праводзяцца нарады па ключавых пытаннях унутранай і знешняй палітыкі. Асаблівую ўвагу наведвальнікаў прыцягнула зала «Беларусь», дзе Прэзідэнт уручае вышэйшыя дзяржаўныя ўзнагароды. Інтэр'ер выкананы з цёмна-зялёнага мармуру, а ўздоўж сцен размешчаны 32 калоны, якія сімвалізуюць ганаровую варту. У заключнай частцы маршруту супрацоўнікі Следчага камітэта наведалі зімовы сад, размешчаны пад шкляным купалам вышынёй 18 метраў. Уздоўж яго расце больш за 150 відаў экзатычных раслін, а ў цэнтры ўстаноўлены фантан, які ўпрыгожаны бронзавымі скульптурамі. Завяршылі агляд у музеі падарункаў, атрыманых Прэзідэнтам ад замежных лідараў, дыпламатычных дэлегацый, грамадскіх арганізацый і простых грамадзян.



Для многіх экскурсія стала напамінам пра важнасць службы і адказнасць, якую супрацоўнікі СК нясуць штодня, забяспечваючы грамадзянам краіны парадак і бяспеку. Сімвалічна, што маладыя следчыя прынялі ўрачыстую прысягу 12 верасня, у дзень 14-годдзя ўтварэння Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь. **Якаў НЕСЦЯРОВІЧ, следчы Фрунзенскага раёна Мінска,** прызнаецца: гэта падзея пакінула пасля сябе асаблівае трапятанне, хваляванне і, вядома, неапісальнае пачуццё гонару:



— Усе мы — маладыя супрацоўнікі, якія сёння прысягнулі на вернасць нашай краіне і яе народу. І для ўсіх нас гэта не проста словы — гэта выбар, усвядомлены, зроблены сэрцам. Вядома, наперадзе яшчэ гады практыкі, навучання, засваення розных методык, каб прымаць выключна справядлівыя рашэнні ў самых няпростых сітуацыях. У гэтым заключаецца наша агульная мэта — забяспечваць і абараняць правы, інтарэсы грамадзян і дзяржавы дзеля міру і стабільнасці Беларусі.

Прадстаўнік старэйшага пакалення следчых, **генерал-маёр юстыцыі Дзмітрый КАНАПЛЯНІК** далёка не першы раз наведвае Палац Незалежнасці: «Вельмі прыемна сёння знаходзіцца тут побач з маладымі калегамі, назіраць за іх эмоцыямі, бачыць, як гараць вочы, калі яны аказваюцца ў залах. Думаю, гэта стане для іх добрым стартам, моцнай матывацыяй сумленна служыць, выконваць свой абавязак, прымнажаць дасягненні нашай прафесіі і годна насіць званне следчага Рэспублікі Беларусь».

**Аміна НАЗАРАВА.**
**Фота БелТА.**

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# САЦЫЯЛЬНАЯ НАКІРАВАНАСЦЬ І СПРАВЯДЛІВАЕ ПАДАТКААБКЛАДАННЕ

## На абмеркаванне экспертнага савета пры Савеце Рэспублікі быў вынесены блок прагнозных дакументаў на 2026 год

На парадку дня пасяджэння — праекты ўказаў Прэзідэнта «Аб найважнейшых паказчыках і параметрах прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2026 год» і «Аб мэтавых паказчыках грашова-крэдытнай палітыкі Рэспублікі Беларусь на 2026 год», а таксама праекты законаў Рэспублікі Беларусь «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2026 год» і «Аб змяненні законаў».



Усе чатыры дакументы сфарміраваны на ўзаемазвязанай і збалансаванай аснове, адзначыў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзіслаў ТАТАРЫНОВІЧ.** «Набор найважнейшых паказчыкаў і параметраў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця не памяняўся ў параўнанні з мінулым годам, — заўважыў ён. — Хачу звярнуць увагу на два моманты — плануюцца рост у рэальным выражэнні даходаў насельніцтва, а таксама ўтрыманне прагнозных параметраў росту спажывецкіх цэн, гэта значыць узроўню інфляцыі. Для гэтага неабходна зладжаная работа ўрада і Нацыянальнага банка».

Традыцыйна рэспубліканскі бюджэт захавае сваю сацыяльную накіраванасць, падкрэсліў сенатар. «У цэлым на ахову здароўя, адукацыю, культуру, сацыяльную абарону, спорт і іншыя сферы плануецца накіраваць каля 40 млрд рублёў. На пасяджэнні экспертнага савета мы звярталі ўвагу на задачу, якую паставіў кіраўнік дзяржавы, — эканоміць кожны бюджэтны рубель. Бюджэт, як і сёлета, будзе сфарміраваны на дэфіцытнай аснове, аднак планавы памер дэфіцыту будзе істотна ніжэйшы, што яшчэ раз пацвярджае неабходнасць правядзення збалансаванай бюджэтнай палітыкі».

Што датычыцца змяненняў у падаткаабкладанні, яны, па словах Уладзіслава Татарыновіча, таксама будуць праводзіцца па традыцыйных кірунках. Па-першае, плануецца індэксацыя ставак, якія былі ўстаноўлены ў беларускіх рублях. У прыватнасці, абмяркоўваецца пытанне акцызаў на нетыповыя курыльныя сумесі і вадкасці для электронных сродкаў курэння. У параўнанні з класічнымі тытунёвымі вырабамі стаўкі на іх ніжэйшыя, аднак, улічваючы патэнцыял шкоды, экспертны савет рэкамендаваў распрацоўшчыкам перагледзець магчымасць павышэння акцызаў на гэтыя вырабы.

**Другі блок** — павышэнне справядлівасці пры падаткаабкладанні. Будуць прапаноўвацца дадатковыя меры, што будуць датычыцца падаходнага падатку для тых грамадзян, якія маюць дадатковы даход, а таксама ў дачыненні да падатку на нерухомасць для тых грамадзян, якія маюць кватэры або немаленькія па сярэдніх мерках для краіны жылыя дамы.

**Трэці блок** — кропкавая наладка асобных пытанняў падаткаабкладання, звязаная з практыкай прымянення.

